# КРЫНІЧКА БАБУЛІНАЙ І ДЗЯДУЛЕВАЙ ДАБРЫНІ



— Лянок, ты чаго сёння такі шчаслівы? — запыталася Васілінка.

— Едзем да бабулі і дзядулі на дачу! Ведаеш, Васілінка, у мяне такая цудоўная бабуля. Яна цукеркі не любіць. Мне іх аддае, нават калі яе пачастуюць.

— Ты ўпэўнены, што яна іх не любіць? – запыталася Васілінка.

А вы ведаеце, што любіць ваша бабуля?

Прачытайце апавяданне «Што любіць бабуля?» і скажыце, які адказ вы падтрымліваеце.

## Што любіць бабуля?

*Алесь Якімовіч*

— Дзеці, што любіць наша бабуля? — аднаго разу запыталася мама.

— Наша бабуля на дачы любіць працаваць, — сказаў Міхась.

— Наша бабуля ежу любіць гатаваць, — зазначыла Кацярына.

— Наша бабуля ў кватэры любіць прыбіраць, — прагаварыў Пятрусь.

— Наша бабуля любіць нашу ласку, — прамовіла Алеся і прытулілася да бабулі.

1. Якое пытанне задала мама дзецям? Ці лёгка было дзецям адказаць на яго? Чаму вы так думаеце?
2. Прачытайце адказы кожнага з унукаў. Чаму яны выказалі такія думкі?
3. Які з адказаў унукаў вам спадабаўся? Чаму?
4. Як бы вы адказалі на пытанне «Што любіць ваша бабуля?»

Адгадайце загадку.

Пад лісточкам на кусточку
Ў чырвоным каптуро́чку
На гародзе вырастала,
Цуда-ягадкаю стала.

*Уладзімір Мацвеенка.*



Труска́лкі — клубніцы.

Хто з вас дапамагаў вырошчваць клубніцы?

## Трускалкі

*Уладзімір Мацвеенка*

Мы з бабуляй
Каля хаткі
Па вясне
Ўскапалі градкі.
Па расаду
Ўдзвюх хадзілі
І трускалкі
Пасадзілі.
Я палоць
Дапамагала
І вадзіцай
Палівала.





Бабка кажа:
— Заўважай,
Будзе добры
Ўраджай...
А сягоння
Паглядзелі:
Цуда-ягадкі
Паспелі.
Назбірала
Ў сподак я:
— Еш,
Бабулечка мая.

1. Якую працу выконвалі бабуля і ўнучка, каб атрымаць добры ўраджай трускалак?
2. Каго дзяўчынка пачаставала спелымі ягадамі?
3. Як ставіцца ўнучка да бабулі? Падмацуйце свой адказ радкамі з верша.
4. Каго пачаставалі б смачнымі ягадамі вы? Якія словы пры гэтым сказалі б?
5. Ад чыйго імя вядзецца апавяданне ў вершы? Уявіце сябе гераіняй (героем) верша і выразна прачытайце яго.

Ве́снічкі — вузкія дзверцы ў плоце, варотцы.
Неўпрыкме́т — непрыкметна; *тут*: нават і сам не заўважыў.

Раскажыце пра свайго дзядулю. Якія цікавыя і карысныя справы вы робіце разам з дзядулем?

## Як сон знайшлі

*Васіль Ткачоў*

Дзед Васіль устаў рана, паглядзеў на ўнука, паправіў коўдру, якая спаўзла на падлогу.

— Спі, унучак. А мой сон недзе згубіўся...

Максімка пачуў дзедавы словы, працёр вочы кулачком:

— Дзядуля, а дзе твой сон згубіўся?

— Дзе, пытаеш? Я і сам не ведаю. Лягу, а не спіцца, усё ўспамінаю розныя здарэнні, перабіраю іх у памяці... А ты чаго не спіш? — хітравата прыплю́снуў вочы дзед.

— Не ведаю, — пакруціў галавой Максімка, а потым прапанаваў: — А давай сёння пашукаем твой сон, а?

— Добра, — згадзіўся дзядуля.

Яны дапамаглі бабулі пакарміць парсючка, курэй, сабаку, а пасля і самі паснедалі.

— Ну што ж, пайшлі, унучак, мой сон шукаць, — узняўся з-за стала дзед Васіль.

Яны выйшлі на двор, узялі кош і пакіравалі на вуліцу. Шырокая вясковая вуліца вывела іх на вузенькую сцежку, якая бегла полем, а потым звярнула ў лес. Там спявалі птушкі. Павольна, быццам на парашуціках, падалі долу першыя жоўтыя лісточкі.

— Дзядуля, глядзі, што я знайшоў! — пахваліўся Максімка і паказаў баравічок.



Грыбоў назбіралі поўны кошык. Дадому лясныя дарункі нёс дзед Васіль. Максімка толькі зрэдку браўся за дужку, падсабляў. Прытупалі ў вёску, адчулі, што натаміліся. Ды вось цікава: абодва зусім забыліся, чаго хадзілі ў лес. Здаецца, сон шукаць, а назбіралі грыбоў.

Селі на лавачку каля хаты, адпачываюць. Дзед сядзеў-сядзеў ды неўпрыкмет і вочы заплюшчыў — заснуў. Выглянула з ве́снічак бабуля, убачыла поўны кошык грыбоў, далонямі пляснула ад здзіўлення.

— Цішэй, бабуля, — шэптам папрасіў Максімка. — Дзед сон знайшоў!

1. Як дзядуля растлумачыў унуку, што ён прачнуўся вельмі рана? Што прапанаваў Максімка? Прачытайце па ролях ранішнюю размову дзеда з унукам.
2. Раскажыце, як Максімка з дзедам шукалі дзедаў сон.
3. Якімі словамі Максімка папярэдзіў бабулю аб тым, што дзядуля заснуў?